**Мэта:** актуалізаваць і пашырыць веды вучняў пра Беларусь, яе славутых землякоў, родную мову; развіваць эстэтычны густ, маўленне, творчае і лагічнае мысленне, эрудуцыю, памяць вучняў; садзейнічаць развіццю цікавасці да гісторыі, традыцый і культуры Бацькаўшчыны, да яе сучаснага жыцця; выхоўваць пачуццё патрыятызму, годнасці і гонару за сваю Радзіму.

**Абсталяванне:**

1. Мультымедыйная сістэма для прэзентацыі.

**Ход гульні:**

( Гучыць песня “Белы бусел”)

**Вядучы 1:** Добры дзень, шаноўныя сябры! Ці заўважалі вы калі-небудзь, на якой прыгожай зямлі мы жывём? Якая багатая яна на звычаі і традыцыі, якую славутую гісторыю мае, колькі знакамітых людзей нарадзіла! Беларусь — край легенд, казак і паданняў. *Зямля пад белымі крыламі, сінявокая Беларусь* — так вельмі часта называюць нашу родную краіну. Яна славіцца сваімі лясамі, рэкамі, азёрамі, працавітымі і шчырымі людзьмі.

Не залаты зусім, не срэбны,

Быў на табе заўсёды ўбор.

Звычайны самы, самы зрэбны:

Зялёны луг ды сіні бор.

Каля дарогі жыта ў полі,

Вярба старая ля ракі

Ды ў жоўтым восеньскім прыполе

Рабін даспелых аганькі.

Ты не сляпіў вачэй.

Быў просты

Ва ўсе вякі твой родны ўзор:

Гаеў бялюткая бяроста,

Густы блакіт лясных азёр.

І лён, зусім, як неба,

Сіні,

І ўсе ў рамонках берагі…

Мой беларускі, мой адзіны

Край, ад калыскі дарагі…

Генадзь Бураўкін

**Вядучы 2:** Мая Беларусь—цудоўны край, знаёмыя з дзяцінства прасторы, якія нязменна здзіўляюць сваёй сціплаю прыгажосцю. Бяздонны блакіт азёр з празрыстай, нібы сляза, вадой—вочы твае. Цяністыя лясы—твае раскошныя валасы, што рассыпаліся па пяшчотных плячах. Твой стан—стройныя бярозкі, што імкнуцца ў бяскрайнюю высь. Сінія васількі ў пшанічным полі—узор на тваім дзявочым убранні.

Зямля мая далёкая,

Зямля мая цудоўная,

Радзіма сінявокая,

Якая табе роўная!

Мо ёсць і прыгажэйшая,

Каму што ў свеце глянецца,

Мая ж найпрыгажэйшая

Да смерці мне застанецца.

**Настаўнік:** Прывітанне, паважаныя сябры! Абавязак кожнага чалавека, грамадзяніна – ведаць гісторыка-культурную спадчыну свайго роднага краю, пастаянна знаёміцца з яго сучаснымі дасягненнямі, памятаць і ганарыцца імёнамі слынных сыноў зямлі беларускай. Я спадзяюся, што наша інтэлектуальна-пазнавальная гульня не толькі абагульніць і сістэматызуе ўжо атрыманыя вамі веды, але і папоўніць іх, абудзіць цікавасць да багатай спадчыны нашай Радзімы.

**Знаёмства з правіламі гульні:**

.

**Пытанні:**

**Знакамітыя людзі зямлі беларускай**

1. ***1.*** Асветнік, першадрукар, вялікі сын Полацкай зямлі. ***(Францыск***

***Скарына)***

1. **2.** Полацкая княжна, ігумення, першая жанчына на ўсходнеславянскіх землях, якая была кананізавана ў святыя, першая беларуская асвет-ніца, нябесная заступніца Беларусі. ***(Еўфрасіння Полацкая)***

1. **3.** У 1775 годзе Кацярына Другая падаравала ў вечнае карыстанне Гомель фельдмаршалу Пятру Аляксандравічу Румянцаву-Задунайскаму. Пасля яго смерці ў 1796 годзе Гомель пераходзіць да аднаго з сыноў Пятра Аляксандравіча. Да каго?

а) Сяргея; б) Міхаіла; ***в) Мікалая.***

1. **4.** Песня “Жураўлі на Палессе ляцяць” з’яўляецца адным з песенных сімвалаў Беларусі.Назавіце аўтара гэтай песні. ***(Алесь Ставер)***
1. **5.** У Мінску ёсць помнік Максіму Багдановічу**.** Паэт трымае ў руцэ кветкі—сімвал Радзімы і роднага мастацтва. Назавіце іх.

***букет васількоў***;

1. **6.** Многія з вас чулі пра род беларускіх магнатаў Радзівілаў. Гэта былі вельмі магутныя і багатыя людзі. А як ва ўсіх багатых і магутных, у іх былі свае дзівацтвы. Аднаму з іх аднойчы захацелася праехацца на санях. Але на двары стаяла лета. Што зрабіў гэты багаты чалавек, каб задаволіць сваю прыхамаць **?**

***засыпаў дарогу соллю***;

1. ***7.*** У 1631 годзе беларускі кнігадрукар Спірыдон Собаль надрукаваў кнігу пад назвай “…сиречь начало учению детям, начинающим чтению извыкати”. У назве С. Собаль упершыню выкарыстаў слова, вельмі добра вядомае кожнаму, хто пачынае вучыцца чытаць. Назавіце першае слова з назвы гэтай кнігі **. *(Буквар)***

**лора і фаўна Беларусі**

1. **1.** Адзін з самых старажытных лясных масіваў Еўропы. Размешчаны на паўднёвым захадзе Беларусі, уздоўж мяжы з Польшчай, на водападзеле басейнаў Заходняга Буга , Нёмана і Прыпяці, у 60 кіламетрах ад Брэста. У межах Беларусі займае плошчу каля 145 тысяч гектараў. Гэты лясны масіў сваю назву атрымаў ад абарончай вежы са сценамі белага колеру, пабудаванай у 13 стагоддзі.

***Белавежская пушча;***

1. **2.** Перакладзіце назву ягад — клюква на беларускую мову*.* ***(Журавіны)***

1. **3.** Бельгійцы ў сваёй сталіцы Брусэлі стварылі музей гэтай расліны. У Беларусь яна завезена з 18 стагоддзя. Так называецца і беларускі народны танец. Людзі пра яе гавораць: “ … — хлебу падмога.” Пра што ідзе гаворка? ***(Бульба)***

1. **4.** Сінявокі прыгажун. Не толькі апранаў нашых продкаў, але і карміў іх. З насення людзі навучыліся атрымліваць залацісты алей. Паўночны шоўк (так называюць яго ў

народзе). Што гэта? ***(Лён)***

1. **5.** Паходжанне назвы расліны звязана з казахскім словам "джэрабай". Трапіўшы ў корм для хатняй жывёлы, часта выклікае захворванне, якое нагадвае ліхаманку. Лекавы сродак ад 99 хвароб.

Сок у расліны крывава-чырвонага колеру. На Беларусі мае назвы: зелле святога Івана, кроўка, дзюравец. Назавіце яшчэ адну назву гэтай расліны. ***(Святаяннік (зверабой))***

1. **6.** Самае старажытнае дрэва ў нашых лясах. Гэта асноўная парода, якая дае драўніну для будаўніцтва, вытворчасці высакаякаснай паперы, штучных валокнаў. З драўніны гэтага дрэва вырабля-юць музычныя інструменты. ***(Елка)***

**Дзяржава і яе сімвалы**

1. **1.** Ён гучыць у самыя ўрачыстыя дзяржаўныя святы.

***гімн***

1. **2.** Якія кветкі знаходзяцца на гербе Рэспублікі Беларусь?

***канюшына***; ***лён***

**4.** Колькі ў Беларусі краін-суседзяў? ***( 5 (пяць))***

Мяжуе з Польшчай, Украінай,

Расіяй, Латвіяй, Літвой

Твой родны край, твая Айчына,

Жыццё тваё і гонар твой.

**Ю. Свірка. “Твая Беларусь”**

**5.** Якую дату адзначаюць беларусы 3 ліпеня?

***Дзень Незалежнасці;***

**6.** Пералічыце абласныя гарады нашай рэспублікі. ***(Мінск, Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна, Магілёў)***

**7.** Наш сцяг мае тры колеры: чырвоны, зялёны і белы. Што сімвалізуе кожны з іх?

***(Чырвоны колер служыць знакам Сонца, сімвалізуе братэрства, барацьбу супраць прыгнёту, а таксама кроў, пралітую ў барацьбе, зялёны колер – Прырода, палі, лясы краіны, гэта колер дабра, росту, развіцця, дабрабыту і міру, белы колер – колер свабоды, маральнай чысціні і мудрасці.)***

**Цікава ведаць!**

1. ***1.*** Аб паходжанні назвы гэтага горада ў сярэдзіне мінулага стагоддзя этнограф П.М.Шпілеўскі запісаў легенду, паводле якой купец, прабіра-ючыся з абозам цераз балота, вымасціў дарогу бярозавай карой. Вярта-ючыся назад, ён пабудаваў капліцу, ля якой вырас горад, што і атрымаў назву ад бярозавай кары. Аб якім горадзе ідзе размова? **(*Брэст)***

1. **2.** Гэтым будынкам з геаметрычнай формай ромбакубаактаэдра можа ганарыцца кожны грамадзянін нашай краіны. “Храм навукі” мае агульную плошчу 112, 6 тысячы квадаратных метраў На 22 паверсе знаходзіцца закрытая назіральная пляцоўка “Панарама”. ***(Нацыянальня бібліятэка Беларусі)***
1. **3.** Якая вада была знойдзена каля палескай вёскі Гарывада?

а) мінеральная вада; ***б) нафта*;** в) святая вада.

1. **4.** У гушчары старых бароў, як сляза, што ўпала з неба, блішчала вялікае возера…

Назавіце самае вялікае па плошчы возера, размешчанае ў Мядзельскім раёне. Пра яго складзена шмат легенд, паданняў, а Максім Танк прысвяціў яму сваю паэму. Побач з возерам размешчаны курорт. ***(Возера Нарач)***

1. ***5.*** Яе ласкава называюць карміцелькай. Раней людзі, калі адпраўляліся ў далёкую дарогу, бралі яе з сабой у мяшэчку. На пахаванні, калі закопвалі дамавіну, сыпалі яе ў яму ( тры жмені) , каб нябожчык ведаў, што яго не забылі, каб яна яму была пухам. ***( Зямля)***
2. **6.** Помнік якой літары беларускага алфавіта ўстаноўлены ў Полацку? ***(Ў (у нескладовае))***

**Змены ў “Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”**

1. ***1.*** Калі пачаў дзейнічаць Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі»? ***(З  1-га верасня 2010 года)***
2. ***2.*** **Знайдзіце памылку!**

На кансіліўм ва ўніверсітэт прыехалі найлепшыя хірургі з Беларусі. (***Кансіліум)***

1. **3.** Адзначце правільнае напісанне: кампутар; ***камп’ютар***; камп’ютэр

1. **4.** Якую літару неабходна ўставіць у лічэбніках с_мнаццаць, вас_мнаццаць? ***(Я)***
2. ***5.*** У якіх з прапанаваных слоў пішацца Э: фламаст_р, прынт_р, Од_р***?***   ***Одэр***
3. **6.** У якіх словах па новых правілах пішацца Ў?

Кло_н

шо_

са_на ***(Клоўн, саўна)***

1. **7.** Як правільна напісаць (В,в)ялікае (К,к)няства (Л,л)ітоўскае, (К,к)анстытуцыйны (С,с)уд (Р,р)эспублікі (Б,б)еларусь?

***(Вялікае Княства Літоўскае, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь)***

**Настаўнік:** Вось і скончана на сёння наша падарожжа па старонках гісторыі і сучаснасці нашага роднага краю. Спадзяюся, што вам было цікава. На матэрыяле гульні вы змаглі ўпэўніцца ў тым, што наша культурна-гістарычная спадчына – бясцэнны скарб, без якога нельга ўявіць сучаснае і будучае жыццё краіны. Вывучайце і беражыце гэта багацце!

**Аб’яўляецца каманда-пераможца і ўзнагароджваецца.**